**Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб**

У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2011 года "Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб" звароты накіроўваюцца ў пісьмовай ці электроннай формах, а таксама ў вуснай форме.

Пісьмовыя звароты падаюцца пасланцам (кур'ерам), па пошце, падчас асабістага прыёму, шляхам занясення заўваг і (ці) прапаноў у кнігу заўваг і прапаноў. Вусныя звароты выкладаюцца падчас асабістага прыёму.

Тэлефон прыёмнай грамадзян і прадстаўнікоў юрыдычных асоб у ААТ "Гасцініца Планета":

+375 (17) 226 78 55 (панядзелак – чацвер з 8:30 да 17:30, пятніца з 8:30 да 16:15).

На асабістым прыёме грамадзяне павінны пры сабе мець дакументы, якія засведчваюць асобу (пашпарт, пасведчанне на права жыхарства, пасведчанне бежанца). Рэкамендуецца таксама мець адказы на папярэднія звароты і іншыя неабходныя для разгляду пытання дакументы. У адпаведнасці з нормамі артыкулаў 12 і 13 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб ветэранах" інваліды і ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны прымаюцца ў першую чаргу.

Прыём ажыццяўляецца па графіку (Графік прыёму грамадзян кіраўнікамі ААТ «Гасцініца Планета»)

Звароты, што паступілі ў арганізацыю, разглядаюцца ў адпаведнасці з:

- Законам Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2011 года "Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб";
- Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 15 кастрычніка 2007 года № 498 "Аб дадатковых мерах па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб".